Святлана Пятроўна Кацуба

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Святлана Пятроўна Кацуба (нар. 6 жніўня 1959, Катоўск, Адэская вобласць, УССР, СССР) — беларуская юрыстка, член Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Рэспублікі Беларусь ад Гомельскай вобласці з 2009 года. Кандыдат юрыдычных навук (1999), дацэнт (2000). Фігурант санкцыйных спісаў ЕС, ЗША, шэрагу іншых краін.

Святлана Пятроўна Кацуба	
Род дзейнасці	юрыст
Дата нараджэння	6 жніўня 1959 (63 гады)
Месца нараджэння	Катоўск, Podilsk city council[d], Адэская вобласць, УССР, СССР
Месца працы	Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога
Альма-матар	Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт (1985) БДУ (1993) Гомельскае музычна-педагагічнае вучылішча[d] (1978)
Узнагароды і прэміі	Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2002) Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2009)

Біяграфія

У 1978 годзе скончыла Гомельскае музычна-педагагічнае вучылішча. З 1978 па 1984 год працавала настаўніцай пачатковых класаў СШ № 45 Гомеля.

З 1984 па 1986 год працавала метадыстам метадычнага кабінета гарадскога аддзела адукацыі Гомеля.

У 1985 годзе скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Гісторыя».

З 1986 па 1993 год працавала выкладчыцай дысцыплін «Грамадазнаўства» і «Асновы дзяржавы і права» у Гомельскім педагагічным вучылішчы.

У 1993 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Правазнаўства». З 1994 па 1999 год працавала старшым выкладчыкам кафедры правазнаўства Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

У 1999 годзе скончыла аспірантуру пры Інстытуце філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З 1999 года працавала загадчыцай кафедры «Гаспадарчае права» Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В. Сухога.

З 2016 года працавала загадчыцай кафедры «Сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін» Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В. Сухога.

Узнагароды

- ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2002);
- ганаровая грамата Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў (2008);
- грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2009).

Санкцыі ЕС, ЗША і іншых краін

У 2011 годзе, пасля правядзення прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 2010 года, якія Еўрапейскім Саюзам былі прызнаныя недэмакратычнымі, а таксама сілавога разгону Плошчы 2010 была ўключана ў Чорны спіс Еўрасаюза[1][2]. У 2012 годзе Савет Еўрапейскага саюза прызнаў Кацубу адказнай як члена ЦВК за парушэнне міжнародных выбарчых стандартаў на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года, потым і на парламенцкіх выбарах 2012 года[3][4]. Еўрапейскія санкцыі былі знятыя 15 лютага 2016 года[5].

31 жніўня 2020 года Кацуба была ўключана ў спіс асобаў, на якіх накладзена бестэрміновая забарона на ўезд у Латвію, пяцігадовая забарона на ўезд у Эстонію і забарона на ўезд у Літву ў сувязі з тым, што *«сваімі дзеяннямі яна арганізавала і падтрымала фальсіфікацыю прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня і наступнае гвалтоўнае задушэнне мірных пратэстаў»*[6].

2 кастрычніка 2020 года Кацуба зноўку трапіла ў Чорны спіс Еўрасаюза[7][8]. Пры абгрунтаванні ўвядзення санкцый было адзначана, што Кацуба як член ЦВК нясе адказнасць за парушэнне правілаў выбарчага працэсу падчас прэзідэнцкіх выбараў 2020 года: невыкананне асноўных міжнародных стандартаў справядлівасці ды празрыстасці і фальсіфікацыю іх вынікаў[9]. Разам з калегамі па ЦВК Кацуба, у прыватнасці, на фальшывых падставах арганізавала нядопуск некаторых кандыдатаў ад апазіцыі і ўвяла непрапарцыйныя абмежаванні для назіральнікаў на выбарчых участках, а таксама забяспечыла прадузяты склад выбарчых камісій, якія знаходзіліся пад наглядам ЦВК[9]. 20 лістапада да санкцый ЕС далучыліся Албанія, Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Паўночная Македонія, Чарнагорыя і Украіна[10]. Акрамя таго, Кацубу ў свае санкцыйныя спісы ўключылі Вялікабрытанія[11][12], Канада[13], Швейцарыя[14][15].

21 чэрвеня 2021 года Кацуба таксама была ўнесена ў спіс спецыяльна прызначаных грамадзян і заблакіраваных асоб ЗША[16][17].

Зноскі

1. Опубликован черный список невъездных в ЕС белорусов (дополнено) (https://www.kp.by/online/news/823644/) (руск.)(недаступная спасылка). КП у Беларусі (2 лютага 2011). Архівавана (https://archive.today/20211002173848/https://www.kp.ru/online/news/823644/) з першакрыніцы 2 кастрычніка 2021. Праверана 22 чэрвеня 2020.
2. COUNCIL IMPLEMENTING REGULATION (EU) No 84/2011 of 31 January 2011 amending Regulation (EC) No 765/2006 concerning restrictive measures against President Lukashenko and certain officials of Belarus (https://eur-lex.europa.eu/legal-content/GA/TXT/?uri=CELEX:32011R0084)
3. COUNCIL DECISION 2012/642/CFSP of 15 October 2012 concerning restrictive measures against Belarus (https://eur-lex.europa.eu/legal-content/GA/ALL/?print=true&uri=CELEX%3A02012D0642-20150715)

4. Council Decision 2012/642/CFSP of 15 October 2012 concerning restrictive measures against Belarus (https://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/?uri=celex%3A32012D0642) (англ.)
5. *Лавникевич, Денис*. Батьке простили старые грехи (https://www.gazeta.ru/politics/2016/02/15_a_8075585.shtml) (руск.). Газета.Ru (15 лютага 2016). Праверана 10 верасня 2021.
6. Латвія, Літва і Эстонія ўключылі Лукашэнку і яшчэ 29 чыноўнікаў ў спіс пэрсон нон-грата. ПОЎНЫ СЬПІС (https://www.svaboda.org/a/30812996.html)
7. *Best, Tom; Bonucci, Nicola; Bukowski, Gesa; Hutchison, Talya*. Protests in Belarus - EU imposes Fresh Sanctions on the Belarusian Regime and Follows the UK, US and Canada in Imposing Sanctions on Lukashenko (https://www.lexology.com/library/detail.aspx?g=5c658b4d-1bea-4d29-9820-45679aa5438a) (англ.). *Paul Hastings LLP*. Lexology (17 лістапада 2020). Архівавана (https://archive.ph/20210724145733/https://www.lexology.com/library/detail.aspx?g=5c658b4d-1bea-4d29-9820-45679aa5438a) з першакрыніцы 24 ліпеня 2021. Праверана 16 верасня 2021.
8. 40 беларускіх чыноўнікаў, якія трапілі пад санкцыі Эўразьвязу. Сьпіс (https://www.svaboda.org/a/30870774.html) (бел. (тар.)). Беларуская служба Радыё «Свабода» (2 кастрычніка 2020). Праверана 13 верасня 2021.
9. Council Implementing Regulation (EU) 2021/339 of 25 February 2021 implementing Article 8a of Regulation (EC) No 765/2006 concerning restrictive measures in respect of Belarus (http://data.europa.eu/eli/reg_impl/2021/339/oj/eng) (англ.) (26 лютага 2021). Праверана 24 ліпеня 2021.
10. Declaration by the High Representative on behalf of the EU on the alignment of certain third countries concerning restrictive measures against Belarus (https://www.consilium.europa.eu/en/press/press-releases/2020/11/20/declaration-by-the-high-representative-on-behalf-of-the-eu-on-the-alignment-of-certain-third-countries-concerning-restrictive-measures-against-belarus/) (англ.). Савет Еўрапейскага саюза (20 лістапада 2020). Праверана 13 верасня 2021.
11. CONSOLIDATED LIST OF FINANCIAL SANCTIONS TARGETS IN THE UK (https://assets.publishing.service.gov.uk/government/uploads/system/uploads/attachment_data/file/996772/Belarus.pdf) (англ.). Office of Financial Sanctions Implementation HM Treasury (25 чэрвеня 2021).
12. *Staff, Reuters*. UK sanctions Belarus leader Lukashenko (https://www.reuters.com/article/us-belarus-election-sanctions-britain-ra-idUSKBN26K2IJ) (англ.). Reuters (29 верасня 2020). Архівавана (https://archive.ph/20210724145005/https://www.reuters.com/article/us-belarus-election-sanctions-britain-ra-idUSKBN26K2IJ) з першакрыніцы 24 ліпеня 2021. Праверана 24 ліпеня 2021.
13. Consolidated Canadian Autonomous Sanctions List (https://www.international.gc.ca/world-monde/international_relations-relations_internationales/sanctions/consolidated-consolide.aspx?lang=eng) (англ.). Міністэрства міжнародных спраў Канады (19 кастрычніка 2015). Праверана 29 чэрвеня 2021.
14. Switzerland joins EU in sanctions against top Belarus officials (https://www.swissinfo.ch/eng/switzerland-joins-eu-in-sanctions-against-top-belarus-officials/46094856) (англ.). Swissinfo (13 кастрычніка 2020). Праверана 13 верасня 2021.
15. SECO: Ordinance on measures against Belarus (https://www.seco.admin.ch/seco/en/home/seco/nsb-news.msg-id-80696.html) (англ.). Дзяржаўны сакратарыят па эканамічных пытаннях (13 кастрычніка 2020). Праверана 13 верасня 2020.
16. OFAC Sanctions List Search (https://sanctionssearch.ofac.treas.gov/), Міністэрства фінансаў ЗША
17. Belarus Designations; Issuance of Belarus General License 3 and related Frequently Asked Questions (https://home.treasury.gov/policy-issues/financial-sanctions/recent-actions/20210621) (англ.). Праверана 24 ліпеня 2021.

Спасылкі

- Біяграфія Святланы Кацубы на сайце Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (http://rec.gov.by/Katsubo)
  Архівавана (https://web.archive.org/web/20201009081732/http://rec.gov.by/Katsubo) 9 кастрычніка 2020.

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Святлана_Пятроўна_Кацуба&oldid=4454457"